Георгій Мікалаевіч Міхалькевіч

# Беларусы ў Польшчы: праблемы нацыянальнай і культурнай самаідэнтыфікацыі

Wschodnioznawstwo 4, 27-35

2010

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Георгій Мікалаевіч Міхалькевіч

# Беларусы ў Польшчы: праблемы нацыянальнай і культурнай самаідэнтыфікацыі

Тэма дадзенагага выступлення – перш за ўсё плён разважання, прэтэнзія на абагульненне ўласных назіранняў, меркаванняў маіх калегаў (на кафедры дыпламатычнай і консульскай службы Белдзяржуніверсітэта ў 2006 г. падрыхтавана выданне «Беларуская дыяспара. Нарысы гісторыі і сучаснага стану»). І ужо пасля – спроба навуковага аналізу.

Згодна са звесткамі апошняга (2002 г.) перапісу насельніцтва ў Рэспубліцы Польшча 48,7 тысяч чалавек назвалі сябе беларусамі. Гэтая лічба ў свой час выклікала дастаткова вострую рэакцыю з боку шэрагу беларускіх палітыкаў, навукоўцаў, публіцыстаў. Яшчэ менш дыпламатычна тэма дыскусавалася ў Інтэрнэце. Прагучалі дастаткова катэгарычныя ацэнкі як адносна самой працэдуры перапісу, так і «мэтанакіраванай палітыкі польскіх уладаў па зніжэнні ўплыву дыяспар у польскім грамадстве»[1]. Такая рэакцыя часткова зразумелая. Бо на думку многіх спецыялістаў, у тым ліку і польскіх, яшчэ ў сярэдзіне 90-х гг. у краіне пражывалі 240-300 тысяч беларусаў[2]. У чым жа прычыны настолькі значнага скарачэння беларускай дыяспары? Што вымушае беларусаў адмаўляцца «беларусамі звацца»?

Пачнем з таго, што праблема самаідэнтыфікацыі нацыянальных меншасцяў сама па сабе надзвычай далікатная, складаная і дыскусійная. Пры яе даследванні непазбежна прыходзіцца сутыкацца з адсутнасцю аб’ектыўных крытэрыяў прызнання нацыянальнай прыналежнасці, з завышэннем ці наадварот з заніжэннем фактычнай колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў, з недабрасумленнасцю складальнікаў падобных спісаў. Як правіла, звесткі кіраўніцтва нацыянальных дыяспар па гэтаму пытанню разыходзяцца з афіцыйнымі звесткамі.

---

1 Н. Романова, *Волк волка слушает, пока кушает*, http://sb.by (12 IV 2009); О. Улевич, В польский сейм попал один белорус, http://www.kz.kp.ru (10 IV 2009).

2 Напрыклад: H. Chałupczak, T. Browarek, *Mniejszości narodowe w Polsce 1918-1995*, Lublin 1998; N. Malinowska, *Białorusini w Polsce*, „Głos znad Niemna”, 28 kwietnia 2000.

Працэй за ўсё нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці нашых суайчыннікаў за Бугам было б растлумачыць толькі палітыкай польскіх уладаў па іх асіміляцыі. Знайшліся б і адпаведныя прыклады. Усё, аднак, больш складана. Прыходзіцца канстатаваць агульную тэндэнцыю скарачэння беларускіх дыяспар за мяжой, у прыватнасці – у Літве, Украіне, Расіі. Так, напрыклад, на III з'ездзе Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі», які праходзіў у кастрычніку 2007 г. у Маскве, агучвалася не менш горкая статыстыка. За апошнія 10-15 гадоў колькасць расійскіх беларусаў скарацілася на 400 тысяч[3]. І справа не ў тым, што яны масава ад'язджаюць, яны папросту асімілююцца, раствараюцца сярод карэннага насельніцтва.

Агульнавядома, што ўзровень нацыянальнай самасвядомасці асобы абумоўлены не толькі яе паходжаннем і выхаваннем ў пэўным культурым асяроддзі, але залежыць і ад уплыву многіх палітычных, эканамічных, сацыяльных фактараў. Адзін і той жа чалавек пры розных абставінах можа залічыць сябе да іншай нацыянальнасці. І польскія беларусы тут не выключэнне. Вядомыя выпадкі, калі пад час таго ж перапісу насельніцтва ў 2002 г. бацькі запісвалі сябе беларусамі, а дзяцей – палякамі[4]. Бо як сумна пажартаваў у свой час кіраўнік адной з грамадскіх арганізацый беларускай меншасці Яўген Ваппа бывае: «Łatwiej być Polakiem»[5].

Абыякавасць значнай часткі этнічных беларусаў да сваіх нацыянальных каранёў, безумоўна, мае свае аб'ектыўныя сацыяльна-эканамічныя прычыны. Пераважна аграрная Беласточчына, дзе заўсёды кампактна пражывала асноўная частка беларусаў ніколі не ўваходзіла ў лік высокаразвітых рэгіёнаў Польшчы, ды і сёння складае крыху больш за адзін працэнт яе эканамічнага патэнцыялу. Маладыя беларусы ў пошуках лепшай долі ў свой час былі вымушаны масава пакідаць свае вёскі, мігрыраваць у цэнтр краіны (асабліва размах гэты працэс набыў у 70-я гг.), паступова гублялі сувязь са сваёй малой бацькаўшчынай. Беларуская мова, культура ў іх асацыіраваліся з беднасцю, цяжкай працай, бесперспектыўнасцю. Зрэшты, падобныя прычыны ўнутранай міграцыі з вёсак у гарады і аналагічныя яе вынікі мы назіралі (ды і назіраем зараз) у самой Беларусі. Толькі польскім беларусам пры гэтым ключ да хуткага кар'ернага росту, поспеху, матэрыяльнага дабрабыту бачыўся ў самапаланізацыі.

Працэс асіміляцыі польскай правінцыі, на жаль, працягваецца і сёння. Большасць жыхароў беларускіх вёсак, спрадвечных захавальніц мовы, куль-

---

[3] Р. Буян, *Можа стацца, што беларусы стануць запісвацца ў палякі*, http://www.gazetaby.com (12 IV 2009).

[4] *Беларуская дыяспара: нарысы гісторыі і сучаснага стану*, М. М. Бацян (red.), Мінск 2006, s. 74.

[5] N. Malinowska, *op.cit.*

туры, традыцый складаюць пенсіянеры. Самапаланізуецца і праваслаўная царква, дзе богаслужэнне пераводзіцца на польскую мову. Ускосным пацверджаннем асіміляцыі беларускай меншасці і вылучэннем яшчэ адной з яе прычын можна лічыць прызнанні, якія часам гучаць у польскім друку, у электронных СМІ аб наяўнасці «пэўных комплексаў у некаторай часткі беларускай дыяспары, якая лічыць, быццам палякі думаюць аб іх з пагардай. Прычым самі палякі гэтага не разумеюць»[6]. Ад саміх польскіх беларусаў, аднак, прыходзілася не раз чуць, што на побытавым узроўні фарміраванне падобных компексаў небеспадстаўнае. Адносіны да меншасці часам атаясамліваюцца з нялепшымі адносінамі да беларускай дзяржавы, паколькі меншаць тут выступае як бы яе прадстаўніком.

І ўсё ж, не хацелася б гаварыць аб незваротнасці азначаных працэсаў. Калі задумацца, то прыведзеныя ў пачатку выступлення звесткі польскага перапісу насельніцтва аб колькасці беларускай меншасці даюць пэўныя падставы і для аптымізму. Нягледзячы на сваю спрадвечную асцярожнасць, схільнасць да прыстасавальнасці да знешніх абставінаў, амаль 50 тысяч нашых суайчыннікаў свядома заявілі аб сваёй нацыянальнай прыналежнасці, што сведчыць аб захаванні беларускай супольнасці непадуладнай працэсам асіміляцыі. Таму нам падаецца, што будучыня беларускай меншасці ў Польшчы залежыць не толькі ад палітыкі польскіх уладаў, але не ў меншай ступені ад самой Беларусі, ад яе палітыкі адносна сваёй дыяспары.

Па зразумелых прычынах вопыт правядзення такой палітыкі ў беларускай дзяржавы (у параўнанні з тым жа польскім вопытам) покуль вельмі сціплы. У свой час улады БССР, тагачасныя грамадскія арганізацыі не мелі сталых кантактаў з беларусамі замежжа. Міжнардныя сувязі былі прэрагатывай Масквы, у тым ліку і на польскім напрамку.

Абмежаванасць эканамічных, палітычных, сацыяльных магчымасцяў суверэннай Беларусі ў 90-я гг. таксама не садзейнічала сістэмнаму дыялогу з дыяспарай. Тым не менш, у азначаны перыяд на самым высокім узроўні быў прыняты шэраг дакументаў, якія вызначылі мэты, канкрэтызавалі формы і механізмы такога дыялогу, у тым ліку пытанні прававой абароны суайчыннікаў, сістэму супрацоўніцтва з іх суполкамі за мяжой. У прыватнасці, у дагаворы паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 г., у шэрагу іншых міжурадавых і міжведамасных пагадненняў (Дэкларацыя Урада Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, навукі і адукацыі ад 18 лістапада 1992 г.; Пагадненні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, навукі і адукацыі ад 27 лістапада 1995 г. і аб прызнанні эквівалентнасці

---

[6] *Модно ли быть белорусом?*, http://www.inosmi.ru (10 IV 2009).

ў вышэйшай адукацыі, раўназначнасці вучоных ступеняў і ступеняў у галіне мастацтва ад 28 красавіка 2005 г; Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам нацыянальнай адукацыі і спорту Рэспублікі Польшча ад 28 красавіка 2005 г.) зафіксаваны намер забяспечыць спрыяльныя ўмовы для захавання, развіцця і выяўлення нацыянальнай, культурнай, моўнай, этнічнай самабытнасці, свабоды веравызнання нацыянальных меншасцяў. Стварэнне такіх умоў залежыць ад настойлівасці абодвух бакоў, у прыватнасці, і ад маральна-палітычнай падтрымкі суайчыннікаў дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі Беларусі, эфектыўнасці іх адукацыйнай, асветніцкай працы з дыяспарай.

Усведамленне гэтага факту прадэманстравана кіраўніцтвам дзяржавы пад час апошняга Паслання Прэзідэнта А. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу: «Лічу, што ў Год роднай зямлі (2009 г. на Беларусі аб'яўлены Годам роднай зямлі. – *Г.М.*) павінны згуртавацца ўсе беларусы: не толькі тыя, хто жыве на радзіме, але і тыя, хто па розных прычынах апынуўся за мяжой. Беларуская дыяспара павінна адчуваць прыналежнасць да падзей, якія адбываюццца ў краіне. Але і мы павінны праявіць свой клопат аб суайчынніках за мяжой»[7].

Праяўленнем такога клопату можна лічыць падрыхтоўку ўпершыню ў гісторыі спецыяльнай праграмы супрацоўніцтва з беларускай меншасцю пад назвай «Беларусы ў Польшчы ў 2005-2010 гадах», зацверджаную Саветам Міністраў Беларусі. Распрацавала праграму Міністэрства замежных спраў пры ўдзеле ведамстваў культуры, адукацыі, інфармацыі, эканомікі, гандлю, Акадэміі навук і інш. На думку былога беларускага пасла ў Польшчы П. Латушкі, з ліку больш дзесяці раздзелаў гэтага дакумента найважнейшыя тыя, якія датычаць адукацыі на беларускай мове, падтрымкі беларусаў ў захаванні нацыянальнай і культурнай самабытнасці, развіцця гаспадарчага супрацоўніцтва пры ўдзеле меншасці[8].

Рытарычнае пытанне: што дазваляе прадстаўніку нацыянальнай меншасці з годнасцю заяўляць аб сваіх нацыянальных каранях? Вядома, у першую чаргу, высокі аўтарытэт дзяржавы-метраполіі, які ўключае шмат складальнікаў: палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя… На жаль, у еўрапейскім грамадскім меркаванні сфарміраваны не лепшы (не ва ўсім, на наш погляд, справядлівы) імідж сучаснай Беларусі. У апошні час беларускія ўлады робяць пэўныя намаганні па яго змяненні, і не толькі ПР-сродкамі. Сістэмная праца з дыяспарай бачыцца адным з важных накірункаў такіх намаганняў.

---

[7] А. Г. Лукашенко, *Благополучие родной земли – дело всех и каждого*, „СБ Беларусь сегодня", 24 апреля 2009.

[8] М. Халадоўскі, *Беларусы ў Польшчы 2005-2010*, „Ніва", 27 сакавіка 2005.

Не выпадкова ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага схода ў 2007 г. быў створаны спецыяльны сектар па працы з суайчыннікамі за мяжой, у склад якога ўвайшлі парламентарыі, супрацоўнікі апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, прадстаўнікі зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў. Як сцвярджае старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі М. Чаргінец, «актывізуючы справу з беларускімі дыяспарамі, мы разлічваем, што яны дапамогуць нам данесці праўдзівую інфармацыю аб Беларусі… Таму што ёсць дзяржавы, дзе інфармацыя аб нашай краіне толькі негатыўная і ў пераважнай большасці скажае рэчаіснасць»[9].

Над рэалізацыяй гэтай задачы працуюць акрэдытаваныя ў Польшчы беларускія дыпламаты, аб чым сведчыць аналіз Інфармацыі аб выніках выканання ў 2008 г. Міністэрствам замежных спраў і замежнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь часткі III Праграмы развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006-2010 гады[10]. Так у канцы 2008 г. беларускае пасольства ў Варшаве падвяло вынікі конкурсу на лепшыя публікацыі і матэрыялы аб Беларусі і беларускіх арганізацыях у Польшчы, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях і прагучалі ў радыё-эфіры. У Беластоку прайшла прэс-канферэнцыя пасла Беларусі, у якой удзельнічалі звыш 10 цэнтральных і рэгіянальных СМІ Польшчы, у т. л. і выданні белменшасці. Увогуле з выданнямі беларускай меншасці («Ніва», «Часопіс», «Пшеглёнд Православны» і інш.) беларускае дыппрадстаўніцтва падтрымлівае рэгулярныя кантакты. Дыпламаты арганізавалі запрашэнне журналістаў для асвятлення міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі Базар у Віцебску», садзейнічалі наладжванню кантактаў карэспандэнтаў выдання «Пшеглёнд православны» з рэдакцыямі беларускіх праваслаўных выданняў. Пералік мерапрыемстваў можна было б доўжыць. Не станем гэтага рабіць. Важны кантэкст: праяўленне беларускай дзяржавай у апошні час асаблівай ўвагі да польскага накірунку працы з дыяспарай суайчыннікаў.

Стан такой працы, рэзервы павышэння яе эфектыўнасці абмяркоўваліся на пасяджэнні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода Беларусі ў траўні 2007 г. у Гродна. Адна з артыкуляваных на пасяджэнні ідэй – адкрыццё

9 Л. Новицкая, *Руку дружбы – соотечественникам за рубежом*, „Республика", 18 мая 2007.

10 *Бягучы архіў Мінсітэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь: Информация о результатах выполнения в 2008 году Министерством иностранных дел и зарубежными учреждениями Республики Беларусь части III Программы развития конфессиональной сферы, национальных отношений и сотрудничества с соотечественниками за рубежом на 2006-2010 годы*, Минск 2009.

пры пасольствах беларускіх культурных цэнтраў у дзяржавах, дзе пражывае значная колькасць этнічных беларусаў[11]. Як вядома, адкрыццё першага Культурнага цэнтра Беларусі (КЦБ) ў Польшчы адбылося ў Варшаве ў чэрвені 2008 г. пад час урачыстага прыёму ў гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У мерапрыемстве бралі ўдзел звыш 500 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, дэпутаты Сейма і сенатары Польшчы, кіраўнікі і супрацоўнікі польскіх міністэрстваў і ведамстваў, ваяводскіх і мясцовых органаў самакіравання, а таксама прадстаўнікі суполак беларускай меншасці[12]. Апошнія з задавальненнем успрынялі гэтую падзею як знак таго, што беларускае пасольства мае намер надалей больш актыўна выступаць свайго роду каталізатарам нацыянальна-культурнага жыцця дыяспары.

Праяўленне цікавасці да культуры этнічнай радзімы, удзел у нацыянальных святкаваннях, членства ў адпаведных суполках, дэманстрацыя свайго нацыянальнага паходжання з'яляюцца неад'емнымі паказчыкамі нацыянальнай самасвядомасці меншасці. Ужо больш за 50 гадоў плённа працуе над захаваннем традыцый, фальклору, нацыянальных звычаяў, архітэктуры ў Польшчы Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Па яго ініцыятыве штогод праходзіць Фестываль беларускай песні ў Беластоку, у якім удзельнічаюць сотні выканаўцаў з усёй краіны. Не меншай папулярнасцю карыстаецца «Беларускае Купалле». Беларускую моладзь з Польшчы і Беларусі збірае фестываль сучаснай музыкі «Басовішча». Цяжка ўявіць якое-небудзь свята на Беласточчыне без удзелу беларускіх фальклорных калектываў «Маланка», «Васілёчкі», эстраднага ансамбля «Прымакі».

У апошні час беларуская дзяржава імкнецца пашыраць сваю культурную прысутнасць у Польшчы, больш настойліва праяўляе патэрналізм у рэалізацыі культурных запатрабаванняў сваіх суайчыннікаў. Цэнтрам духоўнага і грамадскага жыцця беларускай супольнасці стаў Музей беларускай нацыянальнай культуры ў Гайнаўцы, пабудаваны з дапамогай Беларусі. У 2008 г. па ініцыятыве беларускага боку з нагоды святкавання 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа і прысваення іх імёнаў двум вуліцам Гайнаўкі была адкрыта мемарыяльная дошка на будынку Цэнтра беларускай культуры. Беларускае пасольства і консульскія ўстановы сумесна з суполкамі дыяспары праводзяць прэзентацыі беларускай культуры ў польскіх гарадах і мястэчках. Толькі ў 2008 г. прайшло каля 100 такіх мерапрыемстваў, у іх удзельнічалі звыш 80 прафесійных і аматарскіх калектываў з Беларусі. Дні і вечары беларускай культуры наведалі многія

[11] Л. Новицкая, *op.cit.*

[12] *Первый зарубежный культурный центр Беларуси открыт в Польше*, http://www.belta.by (10 IV 2009).

жыхары Беластоку, Варшавы, Гайнаўкі, Гданьску, Лодзі і інш. 17 снежня 2008 г. у Зале кангрэсаў у Варшаве адбыўся канцэрт зорак беларускай эстрады і вядомых польскіх выканаўцаў «З любоўю з Беларусі»[13].

У сваю чаргу ў 2008 г. беларускае дыппрадстаўніцтва, консульскія ўстановы садзейнічалі арганізацыі паездак творчых калектываў беларускай меншасці з канцэртамі на этнічную радзіму, у прыватнасці, для ўдзелу ў традыцыйным свяце «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў» у Гродзенскім раёне, у міжнароднай канферэнцыі «Шлях да ўзаемнасці» і фестывалі «Артыстычныя сустрэчы. Гродна – Беласток», у міжнародных фестывалях «Звіняць цымбалы і гаромонік» у Паставах і «Дубровенскія галасы» у Дуброўна, у Святкаванні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дня горада Мінска і інш. Прафесійныя і аматарскія калектывы мастацкай творчасці Беларусі падтрымліваюць шэфскія сувязі з пераважнай большасцю аналагічных калектываў суполак суайчыннікаў у Польшчы[14].

Аднак, праяўленне нацыянальнай свядомасці польскіх беларусаў, як, зрэшты, і беларусаў у іншых краінах, не можа абмяжоўвацца толькі ўдзелам у фальклорных фестывалях, наведваннем этнаграфічных выстаў і ім падобных мерапрыемстваў. Нацыянальнае аблічча дыяспары ў першую чаргу фарміруецца праз нацыянальную адукацыю.

На жаль, трэба прызнаць адмоўную агульную тэндэнцыю беларускага навучання ў Польшчы. Як вядома, у пасляваенныя гады пад «беларускай адукацыяй» у краіне разумелася навучанне ў школах, дзе ўсе прадметы выкладаліся па-беларуску і ім было ахоплена звыш 11 тысяч чалавек. У 70-я гг. сітуацыя змянілася. У школах, дзе навучаліся дзеці з сем'яў нацыянальных супольнасцяў, усё навучанне было пераведзяна на польскую мову. Нацыянальная мова стала выкладацца асобным прадметам. Колькасць навучэнцаў пачала паволі скарачацца. Але яшчэ дваццаць пять гадоў таму беларускай мове навучалася 4 275 чалавек. У верасні 2005 г. навучанне роднай мове распачалі 3 521 чалавек[15].

Згодна ж з Пратаколам Пасяджэння сумеснай кансультацыйнай камісіі па справах школ для польскай нацыянальнай меншасці ў Рэспубліцы Беларусь і беларускай нацыянальнай меншасці ў Рэспубліцы Польшча, якое адбылося 5-6 красавіка 2009 г. у Варшаве, беларускую мову як прадмет вывучаюць 1 458 вучняў у 21 базавай школе, 917 вучняў у 14 гімназіях і 777 вучняў у ліцэях (Бельску Падляскім, Гайнаўцы і Беластоку)[16]. Такім чынам – 3152

---

[13] *Бягучы архіў Мінсітэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь: Информация о результатах выполнения в 2008 году…*

[14] Ibidem.

[15] М. Савушкіна, *Беларуская адукацыя на Беласточчыне*, http://www.zbsb.org (10 IV 2009).

[16] *Бягучы архіў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: Пратакол пасяджэння сумеснай кансультацыйнай камісіі па справах школ для польскай нацыянальнай меншасці*

навучэнцы. Праўда, аўтары дакумента чамусьці канстатуюць, што «колькасць вучняў, якія вывучаюць беларускую мову, не змяншаецца». Вывучэнне беларускай мовы ажыццяўляецца як прадмет. Факультатыўныя заняткі па беларускай мове для нацыянальнай меншасці не прадугледжаны.

Увогуле аналіз зместу пратакола пасяджэння Камісіі пакідае складанае ўражанне. Добра, што чыноўнікі ад адукацыі нашых краін праяўляць увагу да стану школьніцтва нацыянальных меншасцей. Але пры гэтым, члены Камісіі з польскага боку выказалі беларускім калегам занепакоенасць па цэлым шэрагу пытанняў: праблемы з запрашэннем настаўнікаў з Польшчы на працу ў агульнаадукацыйныя ўстановы Беларусі, неабходнасць актывізаваць дзейнасць метадычных курсаў для настаўнікаў польскай мовы і інш. Беларускі ж бок не палічыў мэтазгодным патурбаваць партнёраў ніякімі сваімі клопатамі. Не хочацца думаць, што наш Мінадукацыі цалкам задавальняе стан спраў у разглядаемай галіне.

І яшчэ цытата: «Навучанне на беларускай мове ў Польшчы не арганізавана з-за незапатрабаванасці вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі»[17]. Падставы для якога роздуму дае гэтая сухая фармулёўка пратакола пасяджэння згаданай Камісіі? У аснове жадання навучацца на роднай мове павінны ляжаць не толькі высокія нацыянальна-патрыятычныя пачуцці, але і больш празаічныя меркаванні: палёгка ў зносінах з суайчыннікамі ў Беларусі, у вядзенні сумеснага з імі бізнесу, далучэнне да агульных культурных каштоўнасцяў і г. д. І тут узнікае праблема, корань якой не ў Польшчы. На вуліцах Мінска і другіх беларускіх гарадоў, на жаль, бывае не менш складана пачуць беларускую мову, чым на вуліцах Беластоку. Нават сярод айчынных інтэлектуалаў, як лаяльных сённяшняй уладзе, так і яе апанентаў, няма адзінства ў разуменні ролі і значэння беларускай мовы, беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў у фарміраванні сучаснага беларускага грамадства. Час ад часу ўзнікае дыскусія аб магчымасці рэалізацыі так званага «крэольскага праекта» – пабудовы новай нацыянальнай традыцыі на аснове запазычання і прысваення чужой мовы і чужых культурных каштоўнасцяў. Ва ўмовах такой дэзарыентацыі ўнутры краіны цяжка чакаць нацыянальнай моўнай і культурнай самаідэнтыфікацыі суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой.

На нашу ж думку, беларуская мова, нацыянальныя каштоўнасці нараўне з імператывамі дзяржаўнай незалежнасці з'яўляюцца лёсавызначальнымі, здольны згуртаваць вакол сябе нацыю, дапамагчы ёй стаць канкурэнтаздольнай сярод іншых народаў. Пад нацыяй, вядома, мы разумеем усіх беларусаў свету.

---

*ў Рэспубліцы Беларусь і беларускай нацыянальнай меншасці ў Рэспубліцы Польшча. г. Варшава 5-6 сакавіка 2009 года*, Мінск 2009.

[17] Ibidem.

Еўрапейская цывілізацыя спрадвечна складвалася і развівалася як плюралістычная, полікультурная. Складаная гісторыя Беларусі і Польшчы – таму пацверджанне. На Беларусі ёсць старажытны горад Гродна – цэнтр польскага культурнага жыцця ў нашай краіне. А ў 70 кіламетрах ад Гродна – ужо цэнтр беларускага культурнага жыцця – Беласток. Нашы продкі вякамі вучыліся жыць ў добрасуседстве і ўзаемапавазе, не гледзячы ні на якія палітычныя гульні. І сучасная этнічная палітыка нашых дзяржаў у адносінах да суайчыннікаў за мяжой і нацыянальных меншасцяў у сваёй краіне павінна будавацца на гэтым трывалым падмурку.


## Summary

Gieorgij Mikołajewicz Michalkiewicz

**The Belarusian in Poland: problems of the national and cultural self-identification**

In this article the historical, social, economic, culturological factors causing the level of the national and cultural consciousness of representatives of the Belarusian diasporas in Poland are investigated. Organizationally legal measures taken by the Polish state for creation of the necessary conditions for preservation, development and display by the Belarusian ethnic minority of the national language and cultural originality, maintenance of the religious freedom are shown. It was concluded that the creation of similar conditions depends on good will and persistence of both parties; in particular it also depends on moral and political mother country's support of compatriots, and efficiency of its educational, enlightening work with the diasporas organizations. Realized projects in this area by the Belarusian state and public institutes are analyzed, an attempt to estimate the degree of their efficiency is undertaken.


**Gieorgij Mikołajewicz Michalkiewicz** – dr nauk historycznych, docent, kierownik Katedry Służby Dyplomatycznej i Konsularnej Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku.